# 1.300.000...



Высокая бронзавая фігура Ільіча з парывіста ўзнятай рукой. Прамені асыпаюць п'едэстал і мазаічную падлогу вестыбюля.

Угару бягуць усходцы. Па іх штодня праходзяць людзі з заклапочаным, сур'ёзным выглядам, са сшыткамі, са скруткамі паперы.

Ідуць рабочыя з «Большэвіка», «Комунара», завода імя Варашылава, працаўнікі Акадэміі навук, студэнты БДУ, палітэхнічнага і педагагічнага інстытутаў, вучнёўская моладзь тэхнікумаў і школ Менска.

З 9-ці гадзін раніцы габінеты, чытальні дзяржаўнай бібліятэкі БССР поўняцца народам. Да вечара 800-900 чалавек праходзяць праз яе прасторныя, светлыя пакоі з незлічонымі паліцамі кніг.

Тут вывучаюць Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, рыюцца ў энцыклапедыях, праглядаюць найноўшыя журналы—узбройваюцца тэорыяй, авалодваюць ведамі.

У хуткім часе нашай дзяржаўнай бібліятэцы споўніцца 12 год. Окладаны і даўгі шлях паступовага ўзбагачэння кніжнага фонда, апрацоўкі кожнага выдання, сістэматызацыі прайшла яна, перш чым накапіць 1.300.000 томаў і перайсці ў адзін з лепшых будынкаў чырвонай сталіцы БССР!

Заснаваная ў 1922 годзе, як універсітэцкая, з 30 тысячамі кніг, дзяржаўная бібліятэка мела ўжо ў пачатку першай пяцігодкі 500 тысяч, а на 1 студзеня 1932 г.—мільён томаў.

У значнай меры дзякуючы выключнай энергіі і старанням нязменнага дырэктара бібліятэкі тав. **СІМАНОЎСКАГА** яна ўзбагацілася радам каштоўнейшых бібліяграфічных укладаў. Бібліятэка на працягу амаль дзесяці год атрымлівае абавязковы экземпляр з усіх друкарань і выдавецтваў Саюза. Бязупынным канвеерам паступаюць у яе кнігасховы дзесяткі тысяч кніжак па самых рознастайных пытаннях літаратуры, навукі, мастацтва.

Зараз у блакітна-шэраватым будынку на Чырвонаармейскай—цэлы кніжны камбінат: Дзяржаўная бібліятэка і бібліяграфічны інстытут БССР імя Леніна, кніжная палата, надзвычай багатыя аддзелы польскай і яўрэйскай кнігі, якія маюць усесаюзнае значэнне, канцэнтруючы ўсе выданні на гэтых мовах, выходзячыя ў СССР.

У гэтым камбінаце—агульная чытальня на 400 чалавек з габінетамі для навуковых работнікаў і аспірантаў, аддзел і чытальня тэхнікі, савецкага будаўніцтва, чытальня і сталая выстаўка перыядычных выданняў, бюро рэкамендацыйнай бібліяграфіі, аддзел масавай работы, даведачна-бібліяграфічны і аддзел міжбібліятэчнага абанемента.

...Вось да круглага століка працаўніцы агульнай чытальні, жвавай дзяўчынкі, падыходзіць пажылы рабочы завода «Большэвік». Яго цікавіць навейшая літаратура па дубленні скур, па тэхналогіі асноўных працэсаў на яго прадпрыемстве.

— Зараз!

Дзяўчынка запісвае некалькі назваў папулярных брашур і кніг на асобны лісток—патрабаванне. Праз 3-4 хвіліны патрабаванне задаволена і слупок брашур—у наведвальніка.

...Вось студэнт літфака просіць выдаць яму «Красное и чорное» Стэндаля. Зноў—некалькі хвілін чакання і кніга з'яўляецца на стале. Улік і падача літаратуры з кнігасховаў наладжана добра.

Са сцяны аднаго з шырокіх калідораў бібліятэкі, з плаката гавораць словы Ільіча:

— «Бачыць гордасць і славу публічнай бібліятэкі не ў тым, колькі ў ёй маецца рэдкасцяй, колькі якіх-небудзь выданняў XVI стагоддзя, альбо рукапісаў X стагоддзя, але ў тым, як шырока абарачваюцца кнігі ў народзе, колькі прыцягнута новых чытачоў».

І ў практыцы дзяржаўнай бібліятэкі гэтая цытата абрастае поўнакроўнымі, жывымі справамі. Варта прасачыць за ростам ліку наведвальнікаў, чытачоў. У 1931 годзе бібліятэку наведала 74 тыс. чалавек, пастаянных чытачоў было зарэгістравана 3.759, выдана кніг 105 тыс. На наступны год гэтыя лічбы павялічыліся так: наведвальнікаў было 161 тыс., пастаянных чытачоў 9 тыс. і выдана кніг 280 тыс. За мінулы-ж 1933 год наведвальнікаў было 220 тыс., чытачоў 12 тыс., а кніг выдана звыш 300 тыс., апроч газет.

З 1-га студзеня пры бібліятэцы адкрылася вялікая выстаўка тэхнічнай кнігі. Яна ахапляе сабою ўсе галіны тэхнікі і народнай гаспадаркі. Літаратура, прадстаўленая на гэтай выстаўцы, дае магчымасць рабочым, калгаснікам, вынаходцам, спецыялістам азнаёміцца з апошнімі навінамі навукі і тэхнікі. Буйнейшыя раздзелы выстаўкі—энергетыка, машынабудаўніцтва, металургія, будаўнічая, лясная, хімічная, тарфяная і іншая прамысловасць.

На выстаўцы апроч агульных пытанняў навукі і тэхнікі, кожную дэкаду дадаткова, пашырана прадстаўляюцца паасобныя галіны мясцовай прамысловасці (адпаведна планам экскурсій).

Да XV з'езда КП(б)Б дзяржаўная бібліятэка адкрывае свае аддзяленні ў Магілеве і Гомелі. У Віцебску такое аддзяленне ўжо існуе даўно.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў дзяржаўнай бібліятэкі на гэты год з'яўляецца арганізацыя самастойнага аддзялення пры Доме Ўрада. У выніку гэтага будзе створана цэнтральная ўрадавая бібліятэка, якая ўключыць у сябе раз'яднаныя датэтуль бібліятэкі паасобных наркаматаў.

Сярод работнікаў бібліятэкі, якіх налічваецца 127 чал., нядрэнна працуе мясцком, разгортваецца палітычная вучоба, расце сетка гурткоў па павышэнню кваліфікацыі. Вырастае зусім новы тып бібліятэчнага работніка—грамадскага дзеяча, актывіста.

**ЮР. ЛЯВОННЫ.**

# ПЕРШАЯ Ў БССР

Пастанова ЦК КП(б)Б аб паляпшэнні культурна-бытавога і медычнага абслугоўвання навуковых работнікаў і студэнтаў—у дзеянні.

Новым практычным крокам у гэтай справе з'яўляецца адкрыццё паліклінікі-больніцы пры **ГОРАЦКІМ** с.-г. інстытуце. Паліклініка і больніца будуць абслугоўваць навуковых работнікаў і студэнтаў інстытута. Гэта — першая ў БССР паліклініка-больніца пры вышэйшай с.-г. навуковай установе.

Новая паліклініка-больніца мае цэлы рад спецыяльных габінетаў, абсталяваных навейшымі прыладамі, у тым ліку і электралячэбніцу.